№8 СТУДЗЕНЬ 2009

Настаўнік.info

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

# ТБШ прыйшло ў школы

Падыходзяць да заканчэння гасцявыя рэйды ў мінскія беларускамоўныя школы і садкі, якія наладзілі прадстаўнікі Таварыства беларускай школы.

Напярэдадні Новага года ТБШ ужо наведала СШ № 60, гімназіі № 14 і 23. Асноўная мэта сустрэч – калядныя віншаванні і ганараванне дыпломамі ТБШ "За прафесійнае майстэрства і выхаванне нацыянальнай свядомасці будучых актыўных грамадзян незалежнай Беларусі" лепшых педагогаў, якія выкладаюць па-беларуску, уручэнне невялікіх падарункаў навучальным установам і настаўнікам.

Да фармавання падарункаў далучыліся шматлікія грамадскія арганізацыі. "Цэнтар Супольнасць" падараваў школам розныя метадычныя дапаможнікі, літаратуру па грамадзянскай адукацыі, а таксама запісаў адмысловы DVD дыск "Гадуем беларусаў", у які ўвайшлі сцэнары дзіцячых святаў, гульні, метадычныя матэрыялы па краязнаўстве і этнашколе, песенькі для маленькіх, аўдыёкнігі, казкі, чытанкі, мультфільмы, мастацкія фільмы і шмат чаго карыснага для настаўніцкай працы. Грамадскае аб'яднанне "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" прэзентавала настаўнікам гістарычныя кнігі, Аб'яднанне бацькоў з Беласточчыны "АБ-БА" падаравала кожнай школе беларускую азбуку – каляровы набор літар алфавіта, які стварыла выдатная беларуская настаўніца з Беластоку Аліна Ваўранюк. Беларуская школка ў Нью-Ёрку і




культурна-адукацыйная фундацыя Орса-Рамана дапамаглі сфармаваць для кожнага беларускага садочка вялікія наборы дыскаў і касет з мультфільмамі, казкамі, песенькамі, а настаўнікам яны падаравалі кнігі беларускіх класікаў: Янкі Купалы, Васіля Быкава, Ніла Гілевіча і іншых. А кампанія "Будзьма!" дапамагла аздобіць падарункі адмысловымі торбачкамі, віншавальнымі паштоўкамі. Ад імя ТБШ педагогаў віншалі Алесь Лозка, старшыня, і Тамара Мацкевіч, намесніца старшыні грамадскага аб'яднання.

На фоне шматлікіх перадкалядных турботаў, а таксама бясконцых рэформаў, праверак, бюракратычных патрабаваньняў, школьныя і дашкольныя ўстановы з задавальненем віталі гасцей з падарункамі і віншаваннямі. У сярэдняй школе г. Мінска, № 60, адзінай, дзе арганізавана навучанне па-беларуску ва ўсіх класах, гасцей весяліў традыцыйнымі песнямі калядны гурт школьнікаў з "зоркай" і "казой". Падарункі і дыпломы ТБШ атрымалі настаўнікі гісторыі Людзміла Крыловіч і Аксана Хахлова, якія шмат намаганняў удзяляюць краязнаўчай працы.

Плённая размова адбылася ў сталічнай гімназіі №14, дзе сёлета ў чатырох першых беларускіх класах навучаецца 84 вучні (падобны вялікі набор адбыўся яшчэ толькі ў 4-й гімназіі). Дарэчы, ў гімназіі №14 працуе знакамітая настаўніца хіміі Тэрэса

*У свеце*

## Дзе жывуць беларускія ялінкі

У дваццаты раз Музей амерыканска-венгерскай фундацыі (New Brunswick, USA) праводзіў фестываль калядных ялінак. На яго адкрыццё завіталі прадстаўнікі розных этнічных супольнасцей, якія суладна жывуць у штаце Нью-Джэрзі.
Зялёныя дрэўцы аднаго росту ўсталявалі ў залах музею арганізатары імпрэзы, а ўжо аздабленне кожны прынёс сваё. І не было двух падобных! Беларусы ўпрыгожылі сваю ялінку саламянымі цацкамі. Майстэрства іх вырабу спыняла ўвагу многіх прысутных. У суседзяў-украінцаў дамінавалі мініяцюрныя вышытыя ручнікі-набожнікі, у латышоў – ваўняныя рукавічкі, тканыя паясы, у італьянцаў – гронкі вінаграду. Цікава, што саломку як матэрыял для творчасці скарысталі таксама эстонцы і шведы. На адкрыцці гучалі прамовы, народная музыка, калядныя спевы, былі і салодкія пачастункі. Беларусы і там засведчылі сваю прысутнасць. У каталогу падрабязна распавядаецца пра



куццю, кісель, ламанцы...
Асноўныя наведнікі музею ў гэты час - школьнікі, якіх такім чынам знаёмяць з культурай народаў іх роднай краіны.

*В.Т.*

ТБШ САБРАЛА ПАДАРУНКІ ДЛЯ БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ ШКОЛАЎ І САДКОЎ Г. МІНСКА >>> СТАР. 1-2

КОНКУРС "БЕЛАРУСКІ НАСТАЎНІК 2008 ГОДА" >>> СТАР. 4

# ТБШ ПРЫЙШЛО Ў ШКОЛЫ

Іванаўна Мятліцкая, якая сёлета стала пераможцай конкурсу прафесійнага майстэрства «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі”. Дырэктар Святлана Босая распавяла пра іншыя поспехі гімназіі. Ганараванні ад ТБШ атрымалі Марыя Гарохава, намесніца дырэктара, Дзмітрый Ровенскі, кіраўнік узорнага фальклорнага ансамбля “Дударыкі”, Святлана Собаль, загадчца бібліятэкі, Наталля Шурдзякова, кіраўніца метадычнага аб’яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

У гімназіі №23, што на праспекце Незалежнасці, былі ганараваны разам з дырэктарам Нінай Нікіцінай у асноўным выкладчыкі, якія развіваюць у дзяцей мастацкія здольнасці (спевы, танцы, выцінанку і г.д.). Гэта – Алена Туміловіч, Вікторыя Бельчанка, Наталля Гамаюнава, Ірына Моніна. Але настаўніцкі калектыў гімназіі унікальны. Тут працуюць выдатныя філолагі-мовазнаўцы, якія выкладаюць шведскую, кітайскую, польскую ды англійскую мовы па-беларуску, вартыя адмысловых ўзнагарод ад ТБШ.

Дзіцячым садкам, № 187, дзе гадуюцца 4 групы беларускамоўных дзетак, і № 534, што мае аж 12 беларускіх групаў, вельмі пашанцавала з загадчыцамі. Гэта дачуваецца адразу, калі ўваходзіш у садочкі. Таццяна Юрчык, загадчыца дзіцячага садка №187 і Ларыса Урулёва загадчыца дзіцячага садка №534 атрымалі дыпломы ТБШ за неабыякавае стаўленне да сваёй працы. Пра такіх кажуць, што яны аддаюць працы ўсю душу. Яны здолелі не толькі сабраць найлепшых дашкольных педагогаў для дзетак, зрабіць музеі, знайсці сучаснае абсталяванне, здабыць мільёны цацак-лялек, нават зрабіць жывы куточак з хамячком і чарапашкамі, але і пасяліць беларускую дух ў свае садочкі. А наогул, ў Мінску існуе каля 100 беларускіх груп у садках.

ТБШ яшчэ наведала дзіцячы садок № 202, дзе ёсьць 2 беларускія групы. Педагогі гэтага садочка распавядалі пра жаданне мець яшчэ больш беларускіх групау, скардзіліся на недахоп метадычных распрацовак для беларускамоўных дзетак, што цяжка знайсці ў продажы беларускія дзіцячыя песні, музыку для фальклорных святаў, сцэнары. Таму былі вельмі ўзрадаваныя атрыманым як па замове падарункам: касетам, дыскам, мультфільмам, метадычнай літаратуры. Асабліва ўпадабалі кнігу “Скарбонка гульняў”, якую выдалі грамадзкія арганізацыі “Чазенія” і “Цэнтар Супольнасць”.



Дыпломамі ТБШ былі ўзнагароджаныя Наталля Анішчук, Ларыса Баброва, Марына Салавей — выхавацелі ДДУ № 187 Мінска, Святлана Купрэйчык, Галіна Грыгор’ева, Аксана Шкрэдава, Галіна Кішкурна, Святлана Занімон – выхавацелі ДДУ №534, а таксама Ірына Юркевіч, загадчыца ДДУ №202, і выхавацелі Наталля Рак і Тацяна Тарлоўская.

У гімназіі №9 г. Мінска ганараванне адбылося падчас педагагічнай нарады, на якой прысутнічалі ўсе настаўнікі. Дыпломы атрымалі Марына Янчэўская, Інэса Андрыянава, а таксама дырэктар – Ларыса Апалінская, якая пры атрыманні дыплома ТБШ пажартавала, што з-за такой ўзнагароды яна можа пазбавіцца працы. Дарэчы, калі б такі ўплыў мелі ўзнагароды грамадскіх арганізацыяў на кадравыя рашэнні адукацыйнага начальства, то ТБШ б дакладна не пераводзіла свае дыпломы на настаўнікаў. Лепш бы пачало з тога самага начальства, якое прыдумляе непадрыхтаваныя рэформы, ды ставарае перашкоды для развіцця беларускамоўнага навучання.

У гімназіі №4, якой кіруе пераможца конкурса ТБШ, лаўрэат звання “Беларускі настаўнік 2007 года” Юры Бандарэнка, сёлета адзначана праца выкладчыкаў Алены Калтовіч (беларуская мова), Уладзіміра Дземідовіча (гісторыя), Кацярыны Богдан (пачатковыя класы), Ірыны Дземідовіч (англійская мова), а таксама намеснікаў дырэктара Наталлі Юшкевіч і Галіны Філіпёнак.

Сёлета мінскай СШ №2 нададзены статус гімназіі (№28). Усе класы тут маюць беларускую мову навучання, гімназія спецыялізуецца на вывучэнні замежных моваў. Вялікая заслуга ў гэтым, безумоўна, былога дырэктара Аляксандра Сядзякі – намесніка старшыні ТБШ, выдатнага выкладчыка фізікі, які за свае педагагічныя, мовазнаўчыя таленты і грамадзянскую працу атрымаў ад ураду Францыі ордэн Акадэмічных пальмаў. ТБШ узнагародзіла выкладчыкаў гімназіі № 28 Таццяну Куракевіч (пачатковыя класы), Вольгу Грышкевіч, Наталлю Штанюк і Наталлю Дабравольскую (беларуская мова).

ТБШ мае намер наведаць яшчэ некалькі дзіцячых садкоў і школаў.

*На фотаздымках ганараванне гімназіі №23 і гімназіі №4 г. Мінска Цалкам фотарэпартажы з садкоў і са школаў можна пабачыць на сайце: www.nastaunik.info/gallery.*

*Алесь Лозка, Тамара Мацкевіч*

*Педагагічная майстэрня*

# Актыўныя метады навучання

## прыклады заняткаў Галіны Дрокінай

**Гульня "Акіян"**

*Фрагмент урока геаграфіі ў 9 класе*

*Тэма:* Эканамічная сістэма дзяржавы. Рыначная і дзяржаўная сістэмы ўласнасці.

Падрыхтоўка да ўрока. Для правядзення ўрока патрабуецца вялікі аркуш паперы фармату А1, набор дробных прадметаў. Правядзенне. У цэнтры пакоя ставіцца стол, на які кладзецца вялікі аркуш паперы. "Уявіце сабе, што гэта акіян", – кажа настаўнік. Запрашаюцца 4 добраахвотнікі, якія выступаюць у ролі рыбакоў.

На стол кладуцца розныя дробныя прадметы, напрыклад гузікі, цукеркі, сашчэпкі, шышкі – гэта рыбы розных відаў, што жывуць у акіяне. Па камандзе настаўніка пачынаецца рыбалка. Звычайна, рыбакі вылоўліваюць з акіяну амаль усю рыбу. Настаўнік просіць кожнага растлумачыць свае дзеянні. Напрыклад, першы ўдзельнік лавіў рыбу дзеля цікавасці, другі – дзеля колькасці, трэці – любіць есці рыбу, чацвёрты – падабаецца працэс лоўлі.

Пасля тлумачэнняў рыбу выпускаюць назад у акіян. Настаўнік не дае ніякіх каментарыяў. Ён дзеліць тэрыторыю акіяна з дапамогай маркера на 4 роўныя часткі і абвяшчае, што кожны гулец мае зараз прыватную ўласнасць. Па камандзе зноў пачынаецца рыбалка. У гэты раз сітуацыя змяняецца: хтосці хутка ловіць рыбу на сваёй тэрыторыі, потым пачынае частку адпускаць. Хтосці пачынае лавіць у суседзяў. Праз некаторы час удзельнікі разгубіліся і не ведалі, што рабіць далей. Яны пачалі вяртаць рыбу назад. У выніку кожны вылавіў усяго па некалькі рыбак са свайго басейна. Настаўнік папрасіў ўдзельнікаў растлумачыць іх дзеянні.

Першы ўдзельнік сказаў, што вылавіў некалькі рыбак для селекцыі, другі – не лавіў, пакінуў на развод, трэці – вылавіў найменшых на продаж, а чацвёрты – вылавіў некалькі рыбак для ежы.

Каментар настаўніка: такім чынам, мы бачым, як змяняюцца адносіны людзей да ўласнасці, калі яна не агульная, а прыватная. Адсюль вынікаюць тэзісы, якія ляжаць у аснове рыначнай эканомікі:

*Кожны выбар мае цану.

*Вынікі нашага выбару знаходзяцца ў будучыні.

*Усе людзі эканомяць.

*Дабраахвотны абмен садзейнічае ўзбагачэнню абодвух бакоў.

*Эканамічная сістэма ўплывае на выбар.

Настаўнік прапануе пракаментаваць гэтыя тэзісы. Далей настаўнік просіць параўнаць дзве эканамічныя сістэмы – рыначную эканоміку і дзяржаўную. Гульня дапамагае дзецям зрабіць высновы, прааналізаваць эканамічныя сістэмы, убачыць іх перавагі і недахопы.

**Геалагічная дылема**

*Фрагмент урока геаграфіі ў 10 класе*

*Тэма ўрока:* Рэсурсы і забеспячэнне.

Падрыхтоўка да ўрока: У сёмым класе мы з вучнямі падлічылі, на колькі гадоў хопіць прыродных рэсурсаў (пры ўмове, што не будзе павялічвацца спажыванне і не будуць разведаны новыя радовішчы). Мы прыйшлі да высновы, што каменнага вугалю хопіць на 250 гадоў, прыроднага газу – на 62 гады, а нафты – на 45 гадоў.

Для правядзення урока патрабуюцца пацеркі трох розных колераў: напрыклад, чорныя, якія адпавядаюць каменнаму вугалю, блакітныя – прыроднаму газу і зялёныя – нафце. Пацеркі бяруцца ў адвольнай колькасці, але працэнтныя суадносіны павінны адпавядаць працэнтным суадносінам прыродных рэсурсаў.

Правядзенне дзелавой гульні. У 10 класе, калі ўзровень ведаў і мыслення ўжо іншы, я з вучнямі праводжу дзелавую гульню. Я рассыпаю пацеркі, якія арпавядаюць розным прыродным рэсурсам, па класе і прашу дзяцей уявіць, што гэта наша планета. А мы з вамі яе жыхары і павінны здабываць прыродныя рэсурсы. Клас дзеліцца на 3 каманды, кожная група шукае толькі адзін з прыродных рэсурсаў. Дзецям даецца пэўны час.

Затым я спыняю гульню і задаю пытанне дзецям: колькі пацерак сабрала кожная каманда, якіх пацерак больш за ўсё? Вядома, што чорных пацерак будзе больш, таму што запасы каменнага вугалю найбольшыя. Цяпер я даю дзецям дадатковы час і дазваляю карыстацца падручнымі матэрыяламі: шчотачкамі, лінейкамі, асадкамі... для пошуку астатніх пацерак. Падчас гульні дзеці адсоўваюць парты, пераварочваюць крэслы, псуюць падлогу, г. зн. ствараюць экалагічныя праблемы на нашай планеце.

Мы з дзецьмі канстатуем факт, колькі працэнтаў прыродных рэсурсаў выбрана і колькі засталося. Паўстае дылема, што нам рабіць:

* Ці захоўваць экалагічную бяспеку?

* Ці цярпець недахоп энергетычных рэсурсаў?

Затым я задаю пытанні:

* А які будзе кошт нашага выбару?

* Што выкарыстоўвалі?

* Колькі затрацілі часу?

* Якая тэхніка ўжывалася пры пошуку?

* Якія навуковыя даследаванні правялі? Пасля прашу вучняў дапамагчы мне навесці парадак у класе.

* Хто мне дапаможа задарма?

* А ці ёсць ахвочыя дапамагчы за дзесяць рублёў?

* А за дзесяць даляраў?

Такім чынам мы бачым, як фарміруецца кошт, цана, попыт на тую ж самую нафту. Гэты метад развівае крытычнае мысленне і дапамагае вучням лёгка засвоіць тэму. Метад па магчымасці можна змадэляваць на іншыя прадметы.

**Паўднёвыя мацерыкі**.

*Фрагмент урока геаграфіі ў 7 класе*

Практыкаванне зручна праводзіць у канцы года ці пасля вывучэння аб'ёмных тэмаў для сістэматызацыі і падагульнення ведаў. Я праводжу гэтае практыкаванне ў 7 класе пасля вывучэння тэмы "Паўднёвыя мацерыкі". Загадзя рыхтую карткі, на якіх напісаны тэрміны і асноўныя паняцці. Картак павінна быць даволі шмат, я кладу іх у скрынку, затым падыходжу да кожнай парты і раздаю па жмені.

Затым я даю вучням заданне раскласці карткі на дзве групы: напрыклад, усё, што адносіцца да Афрыкі – у адну групу, усё, што не адносіцца – у другую. Далей мы працуем з гэтымі ж карткамі, я проста мяняю заданне: напрыклад, знайдзіце ўсе карткі, якія адносяцца да прыроднай зоны. Можна пакінуць заданне, але вучні мяняюцца карткамі, і праца ідзе далей. Гульню можна выкарыстоўваць на розных прадметах, яна дапамагае настаўніку ўбачыць, як вучні засвоілі тэму.

**Сістэма ацэнкі пры выкарыстанні актыўных метадаў навучання**

Пры актыўных метадах навучання важна стымуляваць актыўнасць вучня, ацэньваць не толькі веды, але і ўменне сфармуляваць думку, праявіць лідэрскія якасці, канструктыўнасць і добразычлівасць ў зносінах. Дзеля гэтага, акрамя класнага журнала, я вяду свой, дзе знакамі "+" і " – " пазначаю працу дзяцей на ўроках.

Гэта могуць быць не толькі веды па прадмеце, але і дасведчанасць у тэме, іх асабістыя погляды і думкі, цікавыя прапановы, нестандартныя рашэнні. Калі вучань працаваў на ўроку недастаткова, каб паставіць яму адзнаку, я стаўлю яму "+". Калі набіраецца дзесяць плюсікаў, гэта эквівалент адзнакі 10.

Калі ж вучань не адказаў на пытанне, ён атрымлівае " – ". Адзін "мінус" скасоўвае адзін "плюс". Мінусы таксама могуць назапашвацца і перарастаць у дрэнную адзнаку. Такая сістэма стымулюе працу вучняў на ўроку, робіць іх больш актыўнымі і ўважлівымі, развівае крэатыўнае мысленне.

***тэкст спісаны з відэазапісу майстэрні, для настаўнікаў. Стыль аўтара захаваны. Даведка: Галіна Дрокіна, настаўніца геаграфіі гімназіі №1 Маладзечна, лаўрэат звання Беларускі настаўнік 2007 года.*

# Конкурс "Беларускі Настаўнік-2008"

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай школы» (ТБШ) летась правяло конкурс «Беларускі Настаўнік 2007 года" сярод педагогаў Мінска і Мінскай вобласці. Пераможцамі яго сталі: Юрый Бандарэнка, выдатнік адукацыі БССР, СССР, фізік, дырэктар Мінскай беларускай нацыянальнай гімназіі №4; Уладзімір Мартысюк, заслужаны настаўнік Беларусі і РФ, матэматык СШ №168 г.Мінска; Міхась Тычына, доктар філалагічных навук, прафесар, выкладчык зачыненага Гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа; Наталля Ільініч, настаўніца гісторыі, айчыннай і сусветнай мастацкай культуры Талькаўскай СШ Пухавіцкага раёна; Галіна Дрокіна, выкладчык геаграфіі і эканомікі гімназіі №10 г. Маладзечна; Антаніна Абрамовіч, намесніца дырэктара па этнакласах Мётчанскай СШ-сада Барысаўскага раёна.

**Сёлета РГА "Таварыства беларускай школы" абвяшчае чарговы конкурс "Беларускі настаўнік 2008 года".** У ім могуць прыняць удзел педагогі усіх тыпаў адукацыйных і выхаваўчых устаноў (ад дашкольных да каледжаў), акрамя ВНУ, са стажам працы не менш за тры гады.

**Задачы конкурсу:**

* маральная падтрымка беларускамоўных педагогаў адукацыйных устаноў;
* прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем роднамоўнага выкладання і выхавання ў базавых і сярэдніх школах, дашкольных і пазашкольных установах, ліцэях, гімназіях і каледжах;
* фарміраванне грамадскай думкі аб прэстыжнасці навучання па беларуску;
*аб'яднанне беларускамоўных педагогаў, спрыянне іх супрацоўніцтву, абмену досведам працы, арганізацыі супольных праектаў і інш.

**Крытэрыі вызначэння пераможцаў конкурсу:**

* выкладанне па беларуску дысцыпліны ці правядзенне выхаваўчай працы на роднай мове;
*прафесіяналізм і наватарства, творчасць і навуковасць;
* аўтарытэт сярод калег, бацькоўскай грамадскасці і навучэнцаў;
* высокая грамадзянская пазіцыя.

Для таго, каб прыняць удзел у конкурсе, неабходна на асобу, якая намінуецца на званне "Беларускі настаўнік 2008 года", запоўніць анкету (гл. на гэтай старонцы і ў сецыве па адрасе: http://nastaunik.info/news/911). Анкета запаўняецца рэкамендуючай арганізацыяй, навучальнай установай, калектывам бацькоў ці вучняў або самім педагогам і дасылаецца да **1 сакавіка 2009 года** па электроннай пошце : tbskoly@tut.by, ці звычайнай поштай на адрас: 220051 Мінск, вул. Громава, 38 -21. Лозку А .Ю.

Таварыства беларускай школы вітае іншыя матэрыялы, што пацвярджаюць высокія вартасці кандыдата. Пры неабходнасці журы ТБШ можа наведаць установу канкурсанта.

Конкурс будзе асвятляцца ў прэсе і на старонцы ў інтэрнэце http://nastaunik.info. Даведкі па тэл. 8029 7520821.

Усе дастойныя кандыдаты будуць адзначаны дыпломамі ТБШ, асобна будуць ганараваны тры пераможцы лаўрэаты ў красавіку 2009 г.

Настаўнік.інфо.
Інфармацыйна-метадычны бюлетэнь для настаўнікаў
Выдаецца ініцыятыўнай групай стваральнікаў сайта *Nastaunik.info*
Адрас для допісаў: *nastaunik.info@gmail.com*
Наклад *200* асобнікаў



*На фотаздымку пераможцы конкурсу «Беларускі настаўнік 2007 года» г. Мінска і Мінскай вобласціі разам з Вольгай Іпатавай, Генадзем Бураўкіным і Алесем Лозкам.*

**АНКЕТА**
**на ўдзел у конкурсе «Беларускі Настаўнік 2008 года»**

Прозвішча__________________імя____________________імя па бацьку ______________________________________
Дата нараджэння ______________ і месца нараджэння ________
______________________________________________
Адукацыя (установа)_____________________________
Досвед працы (дзе працаваў і колькі?)________________
______________________________________________
Апошняе месца працы, пасада ______________________
______________________________________________
Прадмет выкладання ____________________________
______________________________________________
Характарыстыка пазакласнай і пазашкольнай дзейнасці (апісанне досведу выхаваўчай працы, публікацыі) ______________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
Грамадская дзейнасць ___________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
Кароткая характарыстыка рэкамендаванага (можна пісаць на асобным лісце)________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
Адрас, тэл. рэкамендаванага _______________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
Прозвішчы і пасады тых, хто рэкамендуе ______________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________

(подпісы і кантактны адрас, тэл.).
«____»_________200___г.